# РАЗАМ У БУДУЧЫНЮ

## Лепшых студэнтаў, якія прыехалі на навучанне з Кітаю, узнагародзілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі



Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Кітаю ў Беларусі Цуй Цымін вітае студэнцкую моладзь

Іх поспехі ў вучобе, навуцы і грамадскім жыцці ўніверсітэтаў адзначыў Міністр адукацыі Ігар Карпенка. Кіраўнік ведамства падкрэсліў важнасць дадзенай сустрэчы: «Мерапрыемства разглядаю як вельмі важнае па дзвюх прычынах. Па-першае, гэта зносіны з маладымі людзьмі, у тым ліку і з навучэнцамі з Кітайскай Народнай Рэспублікі, гэта магчымасць абмеркаваць перспектывы падрыхтоўкі кадраў, абмяняцца думкамі па шырокаму спектру пытанняў, якія хвалююць замежных студэнтаў. Па-другое, наша мерапрыемства асаблівае: мы прымеркавалі яго да рэалізацыі ініцыятывы Года адукацыі Беларусі ў Кітаі. Таму сімвалічна, што сустрэча са студэнтамі праходзіць у нашай галоўнай скарбніцы ведаў — у Нацыянальнай бібліятэцы».

У Кітаі ў гэтым годзе адкрыўся Цэнтр культуры Беларусі ў Пекінскім універсітэце замежных моў і стаў ужо дзявятым у Паднябеснай. У хуткім часе іх стане 10. Цяпер у беларускіх вну навучаюцца амаль 3300 кітайскіх студэнтаў — на тысячу больш, чым летась.

Паводле **БелТА**



Студэнты беларускіх вну ў часе ўручэння ўзнагародаў



БЕЛТА

У Нацыянальнай бібліятэцы прыемна зрабіць сэлфі



Творчы ўзаемаабмен паміж беларускімі і кітайскімі студэнтамі